***Асноўныя падзеі, праблемы і тэндэнцыі тэатральнага сезона 2003/2004 г. у драматычным мастацтве Беларусі***

*(Па матэрыялах рэспубліканскага друку)*
*(Мазура В.Я., галоўны бібліёграф АНІКМ Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі)*

Сёння вялікую ўвагу грамадскасці прыцягваюць су-стрэчы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з кіраўніцтвам твор-чых саюзаў, дзеячамі літаратуры і мастацтва краіны. Кі-раўнік дзяржавы, адзначаючы важную ролю і значэнне культуры і мастацтва ў жыцці народа і краіны, у выхаван-ні чалавека-грамадзяніна і патрыёта, свядома ідзе на ад-крытую прынцыповую гаворку па ўсіх набалелых пытан-нях творчага і вытворчага жыцця. Сустрэчы А.Р.Лукашэн-кі з вядомымі прадстаўнікамі творчых арганізацый краіны набываюць рысы традыцыйнасці. Час, што мінуў ад люта-га 2001 г., калі Прэзідэнт правёў шырокамаштабную нара-ду па пытаннях культурнага будаўніцтва, да сустрэчы з кі-раўніцтвам творчых саюзаў і дзеячамі культуры і мастацт-ва Беларусі 17 снежня 2003 г., пазначыўся важнымі куль-турнымі здабыткамі ў выніку выканання Пратакола прэзі-дэнцкіх даручэнняў. Снежаньская сустрэча 2003 г. стала працягам размовы і сведчаннем дзяржаўнага клопату аб нацыянальных талентах [12].

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 06.01.2004 г. № 1 *Аб прысуджэнні прэміі "За духоўнае адраджэнне "2003 г.* у галіне тэатральнага мастацтва быў узнагароджа-ны вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М.Горкага, народны артыст СССР *Р.І.Янкоўскі*. Прэмія прысуджаецца па прадстаўленні Мі-ністэрства культуры і Беларускай Праваслаўнай Царквы за актыўную падзвіжніцкую дзейнасць у гуманітарнай галіне, накіраваную на развіццё прагрэсіўных традыцый, што са-дзейнічаюць усталяванню духоўных каштоўнасцей, ідэй дружбы і братэрства паміж людзьмі розных нацыянальнас-цей і веравызнанняў.
Паводле Распараджэння Прэзідэнта Рэспублікі Бела-русь ад 06.01.2004 г. № 1 былі прысуджаны *спецыяльныя прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва* за высокія творчыя дасягненні ў 2003 г. У галіне тэатральнага мастацтва ўзнагароджаны вядучы май-стар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы Рэспублікі Беларусь, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь *А.У.Мельнікаў* – за значны ўклад у развіццё бела-рускага опернага

мастацтва, таленавітае выкананне партыі князя Хаванскага ў оперы М.Мусаргскага “Хаваншчына”; галоўны мастак Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я.Купалы, народны мастак Беларусі *Б.Ф.Герлаван* – за значны асабісты ўклад у выхаванне творчай моладзі, пад-рыхтоўку лаўрэатаў рэспубліканскіх конкурсаў; *Гродзенскі абласны тэатр лялек* – за развіццё і ўмацаванне міжна-родных культурных сувязей, выдатнае прадстаўленне бела-рускага тэатральнага мастацтва на міжнародных фестыва-лях у гарадах Люблін (Польшча), Алітус (Літва), Заграб (Харватыя), Разань (Расія).

Распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Лу-кашэнкі ад 09.09.2003 г. зацверджана *Рашэнне Савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва* аб выдзяленні сродкаў на фінанса-ванне расходаў па ажыццяўленні творчай і культурна-ас-ветніцкай дзейнасці, набыцці сцэнічных касцюмаў, абста-лявання, музычных інструментаў і г.д. Былі выдзелены гранты на арганізацыю стажыровак маладых дзеячаў мас-тацтва ў тэатрах Рэспублікі Беларусь і замежных краін – у памеры 10 млн. руб.; на набыццё матэрыяльных сродкаў для ажыццяўлення творчай дзейнасці: *Тэатру-студыі кі-наакцёра* – у памеры 20 млн. руб.; *Рэспубліканскаму тэ-атру беларускай драматургіі* – у памеры 15 млн. руб.; *Магілёўскаму абласному тэатру драмы і камедыі імя В.І.Дуніна-Марцінкевіча (г.Бабруйск)* – у памеры 11 млн. руб. Гэты крок з’яўляецца яшчэ адным прыкладам рэальнай дзяржаўнай падтрымкі развіцця нацыянальнай культуры і дзейсным крокам па стварэнні спрыяльных умоў для пра-фесійнай і аматарскай творчасці, аказанні адраснай пад-трымкі дзеячам мастацтва.

25 сакавіка 2004 г. у Дзяржаўным музеі гісторыі тэат-ральнай і музычнай культуры ў рамках святкавання Між-народнага дня тэатра Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА адзначыла дыпломамі журналістаў, тэатразнаў-цаў і рэжысёраў за ўклад у развіццё міжнародных сувязей і прапаганду беларускага тэатральнага мастацтва. Уладаль-нікамі дыпломаў сталі рэжысёры *А.Жугжда* і *В.Баркоўскі*, тэатральныя крытыкі *Н.Бунцэвіч*, *Л.Грамыка*, *Т.Арлова*, *М.Бартніцкая*, *Г.Герштэйн* і генеральны сакратар Бела-рускага цэнтра Міжнароднага інстытута тэатра ЮНЕСКА *А.Міхальцова*.
Адбылося таксама ўручэнне прэміі імя заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь І.Ушакова. Узнага-рода прысуджана мастаку Дзяржаўнага тэатра лялек *А.Вахрамееву*.

Традыцыйна 27 сакавіка 2004 г., у Міжнародны дзень тэатра, Беларускі саюз тэатральных дзеячаў разам з Міні-стэрствам культуры адзначылі ўзнагародамі шэраг прад-стаўнікоў тэатральнага мастацтва. За яркае і таленавітае жыццё ў мастацтве актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я.Купалы *М.Захарэвіч* узнагароджана прызам "Крыштальная Паўлінка". За вялікі ўклад у тэатральнае мастацтва Беларусі прыз "Крыштальная Зорка" быў уруча-ны загадчыку музычнай часткі Нацыянальнага акадэміч-нага драматычнага тэатра імя М.Горкага *А.Еранькову*. Прызам "Крыштальная Кветка" адзначаны яркі таленавіты дэбют актрысы Магілёўскага абласнога драматычнага тэ-атра *Я.Белацаркоўскай*. Уладальнікам прыза "Крышталь-ны Агонь" стала акцёрская дынастыя *Сідаравых-Асмалоў-скіх*. За яркія дасягенні ў тэатры лялек прызам "Крыш-тальны Анёлак", які ў гэтым годзе ўручаўся ўпершыню, быў узнагароджаны акцёр Дзяржаўнага тэатра лялек *У.Уласаў*.
Дыпломамі Беларускага саюза тэатральных дзеячаў за высокі прафесіяналізм адзначаны вядомыя тэатразнаўцы *А.Сабалеўскі, Т.Арлова, Т.Гаробчанка*.

22 студзеня 2004 г. адбылася выніковая калегія Міні-стэрства культуры Рэспублікі Беларусь, прысвечаная ана-лізу дзейнасці галіны за 2003 г. Адзначалася, што станоў-чымі характарыстыкамі мінулага года сталі: эфектыўнае рэфармаванне сеткі ўстаноў культуры і мастацтва, узнік-ненне новых кірункаў у развіцці тэатра і іншых відаў мас-тацтва, актыўнае ўваходжанне ў вялікае мастацтва талена-вітай моладзі, павышэнне якаснага ўзроўню культурна-асветніцкай працы, правядзенне значнай колькасці неаб-ходных насельніцтву фестываляў, конкурсаў, аглядаў, свят мастацтва, паспяховы ўдзел у міжнародных конкурсах і фестывалях і г.д.
У 2003 г. рэпертуарная афіша беларускіх тэатраў па-поўнілася 108 новымі спектаклямі, у тым ліку 88 паста-ноўкамі ў тэатрах драмы і 20 – у тэатрах лялек. Драматыч-ныя тэатры краіны падрыхтавалі 20 новых спектакляў па творах айчыннай драматургіі. Усяго драматычнымі тэатра-мі за 2003 г. паказана 3053 спектаклі (у 2002 г. гэта лічба складала 2966). Сярэдняя запаўняльнасць глядзельных за-лаў склала ў драматычных тэатрах 77% (у 2002 г. – 73%).
Тэатральна-відовішчныя арганізацыі зарабілі ў 2003 г. 5,9 млрд. руб., што складае 35% ад агульных паступлен-няў на іх утрыманне. Ад правядзення спектакляў, канцэр-таў і іншых відовішчных мерапрыемстваў атрымана 92% уласных прыбыткаў [10].

26 лютага 2004 г. калегія Міністэрства культуры Рэс-публікі Беларусь прыняла Рашэнне *“Аб выкарыстанні сродкаў рэспубліканскага бюджэту і Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мас-тацтва па набыцці рэпертуарных твораў і іх практыч-ным прымяненні ў творчых калектывах”*. Калегія адзна-чыла, што ў гэтым напрамку дзейнасці склалася пэўная практыка работы, якая цалкам забяспечвае патрэбы твор-чых калектываў у новых узорах нацыянальнай музыкі і драматургіі і накіравана на рашэнне задач па стварэнні рэпертуару актуальнага праблемна-тэматычнага гучання і высокага мастацкага ўзроўню.

Міністэрствам культуры штогод у сярэднім набываецца 30–35 п’ес, інсцэніровак і перакладаў твораў сусветнай дра-матургіі. Па выніках 2003 г. за кошт бюджэтных выдаткаў набыта 29 арыгінальных і перакладных п’ес для тэатраў на суму 29,4 млн. руб. (ў  2002 г. – 30 твораў на суму 22,4 млн. руб.).

Магчымасці набыцця твораў за кошт бюджэтных срод-каў, значна замацавала прыняцце Пастанова Савета Міні-страў Рэспублікі Беларусь ад 29.11.2000 г. № 1818*“ Аб мінімальных стаўках аўтарскага ўзнагароджвання за выкананне заказаў на стварэнне твораў літаратуры і мастацтва для публічнага выканання або за права пер-шага публічнага выканання неабнародаванных твораў”*, якой рэгламентуюцца толькі мінімальныя стаўкі ганара-раў. Гэта дазволіла дыферэнцыравана падыходзіць да ацэн-кі вынікаў творчай працы кожнага аўтара, забяспечыла магчымасць прыцягваць да работы па напісанні драматур-гічнага і музычнага рэпертуару вядучых майстроў мастацт-ваў.

Набытыя Міністэрствам культуры ў 2003 г. творы дра-матургіі ўяўляюць сабой шырокі жанравы дыяпазон і ак-туальнае праблемна-тэматычнае гучанне, 34% з іх адраса-ваны гледачам дзіцячага і юнацкага ўзросту.

Значны творчы рэзананс пры пастаноўцы набытых у 2003 г. п’ес меў шэраг твораў, у тым ліку *“Споведзь Піла-та”* (Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі) і *“П’емонцкі звер”* (Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я.Коласа) маладога драматурга А.Курэйчыка, *“Сняданак на траве”* А.Паповай (Нацыянальны акадэміч-ны драматычны тэатр імя М.Горкага), *“Тарас на Парнасе”* С.Кавалёва (Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я.Коласа) і інш.

У выніку рэгулярна наладжаных (адзін раз у два гады) рэспубліканскіх конкурсаў драматургіі за апошні час зама-цавалі свае творчыя пазіцыі маладыя драматургі, сярод якіх А.Курэйчык, А.Карэлін, Я.Русакевіч,

В.Любецкі, А.Шчуцкі.
З мэтай папулярызацыі рэпертуарных навінак з 1994 г. штогадова выдаецца зборнік “Беларуская драматургія”. У 2003 г. пры Беларускім дзяржаўным інстытуце праблем культуры арганізаваны Цэнтр драматургічнай творчасці, які прапагандуе новыя рэпертуарныя набыткі праз сетку Інтэрнет і спецыяльныя друкаваныя выданні.
З улікам задач, пастаўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на сустрэчы з творчай інтэлігенцыяй 17 снежня 2003 г., неабходна ўзмацніць ролю мастацкіх саветаў у фарміраванні новага беларускага рэпертуару, які садзейні-чае развіццю духоўнага ўзроўню грамадства, патрыятызму, грамадзянскасці. Прыярытэтным напрамкам у набыцці аўтарскіх работ усіх жанраў павінна стаць запатрабава-насць твора з боку выканаўцы і гледача.
У працэсе стварэння рознажанравага рэпертуару для калектываў і выканаўцаў прафесійнага мастацтва больш важную ролю павінна адыгрываць практыка стварэння ін-сцэніровак па лепшых узорах беларускай класічнай і су-часнай літаратуры. Пастаяннай, мэтанакіраванай і рознаба-ковай павінна стаць праца ў галіне напісання рэпертуару для дашкольнай, школьнай і юнацкай аўдыторыі.
Неабходна звярнуць увагу на стварэнне новых тыпавых дагавораў па набыцці твораў у адпаведнасці з апошнімі зменамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь і патрабавання-мі па ахове аўтарскіх і сумежных правоў [32].

У мэтах увекавечвання гераічнага подзвігу народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, узмацнення ролі тэатраль-нага мастацтва ў арганізацыі ідэалагічнага і эстэтычнага выхавання, развіцця ў сучасным грамадстве высокай на-цыянальнай самасвядомасці і патрыятызму Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь выдала загад аб правядзенні з 1 кастрычніка 2003 г. па 25 красавіка 2004 г. *Рэспублі-канскага конкурсу на стварэнне п’ес для тэатра пад дэвізам “Дзень Перамогі”*.
Сярод пераможцаў у намінацыі “п’еса для драматычна-га тэатра” другой прэміі ўдастоена п’еса “*Калодзеж*” А.Дзялендзіка (першую прэмію вырашана не прысуджаць). Тры трэціх прэміі атрымалі п’есы *“Бліндаж”* А.Паповай, *“Такая доўгая навальніца”* С.Бартохавай і *“Так я і зрабіў”* В.Паніна. Першую прэмію журы не прысудзіла і ў наміна-цыі “інсцэніроўкі паводле твораў беларускай драматургіі”. Другую прэмію атрымаў твор П.Васючэнкі паводле “Млечнага шляху” К.Чорнага, трэцюю – інсцэніроўка *Ф.Конева* паводле паэмы “Сцяг брыгады” А.Куляшова. Акрамя таго, журы конкурсу прысудзіла шэсць

заахвоч-вальных прэмій. Іх атрымалі тры п’есы *М.Шэлехава* і па адной – п’есы *Г.Марчука, А.Дударава, Г.Станкевіча.*

20–21 мая 2004 г. у памяшканні Беларускага дзяржаў-нага інстытута праблем культуры прайшоў семінар *“Рэ-жысёры і драматургі: прынцыпы творчага ўзаемадзеян-ня”*, арганізаваны Міністэрствам культуры Рэспублікі Бе-ларусь, Беларускім дзяржаўным інстытутам праблем куль-туры і Цэнтрам беларускай драматургіі. У ім прынялі ўдзел каля 40 рэжысёраў, драматургаў і акцёраў з прафесійных і аматарскіх калектываў краіны. У межах семінара прайшоў “круглы стол” па выніках прагляду спектакля Рэспублі-канскага тэатра юнага гледача *“Тарас на Парнасе”* па п’есе С.Кавалёва, адбылася прэзентацыя зборнікаў п’ес *“Вірту-альнае зубраня”* І.Сідарука і *“Кветкі для анёла”*. Семінар паспрыяў усталяванню творчых кантактаў паміж драма-тургамі і рэжысёрамі, акрэсліў шэраг праблем, якія патра-буюць вырашэння [2].

Калі заходзіць гаворка пра сацыяльныя функцыі тэат-ра, многія перш за ўсё адзначаюць яго выхаваўчае зна-чэнне, асабліва гэта тычыцца дзіцячай і маладзёжнай аўдыторыі. Аднак гэта далёка не адзінае, што можа “пра-панаваць” тэатр грамадству. Сёння вялікую папулярнасць у свеце мае ідэя тэатральнай тэрапіі. Яна ўвасоблена ў пра-екце *“Школа–тэатр–тэрапія”*, які рэалізуецца кафедрай узроставай і педагагічнай псіхалогіі факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій Дзяржаўнага педагагічнага уні-версітэта імя М.Танка сумесна з Рэспубліканскім тэатрам юнага гледача. ТЮГ – тэатр, асноўная глядацкая аўдыто-рыя якога, дзеці і падлеткі, знаходзяцца ў адным з самых складаных з псіхалагічнага пункта гледжання ўзросце, калі фарміруюцца іх сацыяльныя паводзіны. І менавіта тэатр з яго “жывымі” акцёрамі і непасрэдным кантактам сцэны і глядзельнай залы, спектаклямі, якія нясуць у сабе зарад дабрыні і пазітыўнай энергіі, здольны, як лічаць аўтары праекта, да пэўнай карэкцыі падлеткавай псіхікі, часта надламанай няпростай для дзіцячага разумення навакольнай рэчаіснасцю. Але праект гэты накіраваны не толькі на працу з дзецьмі. Адным з не менш важных на-прамкаў бачыцца і выхаванне педагогаў, для якіх навед-ванне з дзецьмі тэатра рабілася б не чарговай “галачкай” у пазакласнай працы, а мэтанакіраванай і арганічнай част-кай навучальнага працэсу і якія, прыводзячы ў тэатр дзя-цей, сядзелі б падчас спектакля не ў холе, а разам з дзець-мі ў глядзельнай зале, жыва ўспрымаючы ўсё, што адбыва-ецца на сцэне. Першыя свае крокі праект “Школа–тэатр–тэрапія” ўжо распа-чаў.

Адбыліся прагляды такіх “знакавых” для ТЮГа спектакляў, як *“Шляхі цароў“ ,”Паліяна“ ,”Стварыўшая цуд“ .*”Жывы” кан-такт, адкрытыя ўзаемаадносіны, дзе не толькі акцёры аказваюцца “пачутымі”, але і самі гледачы маюць права выказацца адносна сцэнічных герояў, і спараджаюць той тэрапеўтычны эфект, які ўзнікае ад адкрытых і шчырых чалавечых стасункаў, што выхоўваюцца пад уплывам доб-рых, светлых і гуманных спектакляў [33].
Абудзіць цікавасць дзяцей да тэатра, развіць іх твор-чыя здольнасці, спрыяць фарміраванню іх эстэтычнай свядомасці – асноўныя мэты конкурсу *“Любім тэатр з дзяцінства”*, які вясной 2004 г. правёў ужо ў трэці раз клуб “Таленты і прыхільнікі” сумесна з Рэспубліканскім тэатрам юнага гледача. Дзеці павінны не проста паглядзець спектакль, а ўсвядоміць для сябе яго як твор мастацтва – менавіта таму і ўзніклі такія конкурсныя намінацыі, як “тэатральная рэцэнзія“ ,”тэатральная віктарына“ ,”тэат-ральная адгадайка“ ,”афіша да спектакляў ТЮГа”, добрае веданне якіх і вызначала кірунак да перамогі. Усяго на конкурс паступіла каля 400 работ, пераможцамі былі на-званы 39. Узрост удзельнікаў вагаўся ад 4 гадоў да 17, таму было вырашана ў кожнай намінацыі вылучыць 3 узроставыя катэгорыі. Свята тэатра атрымалася яркім, відовішчным, цікавым, яно пераканаўча пацвердзіла, што тэатр і сёння з’яўляецца неад’емнай часткай жыцця на-шага грамадства [13, 29].

5 верасня 2003 г. у памяшканні Мінскага драматыч-нага тэатра “Дзе–Я?” адбылося ўрачыстае адкрыццё *Дзі-цячай тэатральнай школы № 1*. Было прынята 27 хлоп-чыкаў і дзяўчынак, якія паспяхова вытрымалі ўступныя экзамены і на працягу 5 гадоў будуць вывучаць асновы тэатральнага мастацтва [36].

3 кастрычніка 2003 г. у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я.Купалы адкрыліся Дні тэатра Швецыі, арга-нізаваныя сумесна са Шведскім інстытутам і консульствам Каралеўства Швецыі ў г.Мінску. У рамках Дзён адбыліся чытанні п’ес сучасных шведскіх драматургаў беларускімі акцёрамі, выступленні–семінары шведскіх драматургаў, лекцыя–канцэрт аб сучаснай тэатральнай музыцы Швецыі, прэм’ера спектакля *“Барух–Эмануэль”* па п’есе шведскага журналіста Дз.Плаксы (былога нашага суайчынніка). П’еса была напісана некалькі гадоў таму па замове Каралеўскага драматычнага тэатра Швецыі. Купалаўскія акцёры П.Маў-чанаў, Р.Падаляка, П.Яскевіч прадстаўляюць “філасофскі дыялог у трох асобах”. Даволі складаную для сцэнічнага ўвасаблення п’есу, у якой ва ўяўленні Чалавека спрача-юцца два знакамітыя

філосафы, Спіноза і Сведэнборг, па-ставіла малады шведскі рэжысёр Н.Рынглер [37].
Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я.Купалы заўсёды славіўся тым, што звяртаўся да цікавай драматургіі. Гэтай жа мэце служыў і мінулагодні (2003 г.) драматургічны конкурс, дзе галоўнай узнагародай была пастаноўка твора-пераможцы на Купалаўскай сцэне. У снежні 2003 г. п’еса-пераможца набыла сваё сцэнічнае аблічча: на Малой сцэне тэатра адбылася прэм’ера спектакля *“Налу”* па творы, на-пісанным акцёрамі тэатра Я.Русакевіч і В.Любецкім. Твор-чая “каманда” спектакля “Налу” – маладая, што для бела-рускага тэатра даволі нетыпова: у сучасных эканамічных умовах тэатр не можа дазволіць сабе “непрыбытковых” эксперыментаў, а таму да пастаноўкі звычайна выбіраюцца творы, якія даюць больш-менш стабільныя гарантыі поспеху. Не быў выкарыстаны і прынцып тандэма “мэтр–пачатковец”, дзе малады творца “робіць” сабе імя “пад крылом” прызнанага калегі, а той, у сваю чаргу, “асвяжае” ўласны досвед свежымі ідэямі першага. Натуральна, што такі падыход у тэатры быў успрыняты насцярожана [22].
Трэба адзначыць, што сёння Купалаўскі тэатр – адзін з самых “маладых” тэатраў, дзе, да ўсяго, маладыя акцёры яшчэ і запатрабаваныя. Рэжысёр У.Шчэрбань заняў у спек-таклі “Налу” акцёраў з вялікім творчым патэнцыялам, які, аднак, не ва ўсіх паспеў раскрыцца на сцэне. Гэта Д.Еся-невіч (Вэн) – сёлетні выпускнік Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, і, думаецца, адзін з самых значных “набыткаў” тэатра за апошнія некалькі гадоў; мінулагодні выпускнік акадэміі П.Яскевіч (Мік); галоўная гераіня спектакля і аўтарка п’есы Я.Русакевіч (Налу), якую гледа-чы бачылі ў шэрагу спектакляў Купалаўскага тэатра.
У тэатры, які ва ўсе часы славіўся найперш сваімі акцёрамі, прадстаўнікі самага маладога пакалення кінулі выклік сучаснаму “апасродкаванаму” тэатру і не пабаяліся выйсці да гледачоў такімі, якія ёсць, без яркай знешняй тэатральнай формы, з вельмі лаканістычнай сцэнаграфіяй. Гэта вымагае ад акцёраў гранічнай шчырасці ва ўсім, што адбываецца на сцэне.
Рэжысёр У.Шчэрбань абапіраецца на жыццевую закна-мернасць: часта каб зразумець тую ці іншую праблему, зу-сім недастаткова зірнуць на яе зверху, а неабходна “пакор-пацца” ўнутры яе, і тады, магчыма, удасца адкрыць яе першапрычыны. Менавіта гэтым і займаецца рэжысёр у спектаклі. Да разумення праблемы ён падыходзіць праз асмысленне сістэмы трывалых маладзёжных стэрэатыпаў, сфарміраваных масавай культурай. Робіцца гэта для таго, каб разбурыць гэтыя стэрэатыпы і тым самым прымусіць герояў і гледачоў задумацца над сапраўднымі каранямі

праблем, якія мы бачым у спектаклі. Нам даюць зразу-мець, што ў сучасным жыцці няма “святых” і “грэшных”, а ёсць людзі са сваімі складанымі характарамі, якія і ро-бяць жыццё такім, якім яно ёсць [22]. Разам з тым крыты-кі адзначаюць, што пастаноўцы не хапае глыбіні, вобразы герояў застаюцца амаль не раскрытыя. Рысы часу прысут-нічаюць у творы толькі на знешнім узроўні. У спектаклі ёсць яркія, дынамічныя сцэны, але, на жаль, іх недастат-кова. Адзначаецца, што стварэнне такога спектакля, як “Налу”, разлічанага менавіта на маладзёжную аўдыторыю, – з’ява цікавая і важная. Аднак, імкнучыся зрабіць сучасны спектакль, нельга абмяжоўвацца толькі знешняй формай. Але ж гэта – першы крок маладых аўтараў, таму можна спадзявацца, што неўзабаве мы пабачым новыя творы Я.Русакевіч і В.Любецкага, якія сапраўды можна будзе назваць творамі “новай хвалі” [3].

8 снежня 2003 г. на Малой сцэне Нацыянальнага ака-дэмічнага тэатра імя Я.Купалы ў рамках праекта “Тэатр п’есы” адбылася прэм’ера драматургічных твораў *“Немой поэт”* і *“Паутина”* пачынаючага аўтара Г.Цісецкага пад мастацкім кіраўніцтвам В.Раеўскага і А.Іваннікавай.

21 снежня 2003 г. у Купалаўскім тэатры адбылася прэм’ера казкі *“Афрыка”* па паэме Л.Пранчака. Рэжысёр спектакля Г.Давыдзька.

30 і 31 студзеня 2004 г. на сцэне тэатра прайшлі прэм’ерныя паказы пластычнага спектакля *“С.В.”* паводле п’есы А.Чэхава “Вішнёвы сад”. Рэжысёр пастаноўкі П.Адамчыкаў. Прычыны, па якіх Купалаўскі тэатр звяр-нуўся да “Вішнёвага саду”, на думку крытыкаў, відавоч-ныя: тэатр вырашыў стварыць на сваёй сцэне шоу і дака-заць, што нават такая “нудная” п’еса са школьнай прагра-мы па рускай літаратуры можа быць прадметам шоу-бізнесу. Спектакль пазначаны ў афішы як пластычны і мае загадкава-камерцыйную назву “С.В.”. Аднак, як адзнача-юць крытыкі, пастаноўшчык спектакля П.Адамчыкаў спраціў чэхаўскі твор па максімуму, выкінуўшы цэлы шэраг “непатрэбных” для сюжэта персанажаў, а тых, хто застаўся на сцэне, “пазбавіў” сваіх “ідэнтыфікацыйных” чэхаўскіх рыс, ператварыўшы ў абстрактна-абагуленыя вобразы. Думаецца, менавіта такая “абстрактнасць” і са-служыла рэжысёру кепскую справу, ператварыўшы ціка-вую задуму ў такі ж “абстрактны” спектакль, у якім няма нічога канкрэтнага. Дарэчы, у гэтым спектаклі не ўзнікае захаплення і зачараванасці пластыкай, уменнем акцёраў танцаваць, як гэта было ў папярэднім спектаклі П.Адам-чыкава *“Больш, чым дождж*] ”24].

9 чэрвеня 2004 г. на сцэне Купалаўскага тэтра гледачы ўбачылі прэм’еру спектакля *“Эрык XIV”* па п’есе А.Стрындберга ў пастаноўцы В.Раеўскага.

Увага да яе абу-моўлена шэрагам абставін. Па-першае, гэта першы твор славутага шведскага драматурга, пастаўлены на сцэне га-лоўнага тэатра краіны. Па-другое, на рост цікавасці да спектакля паўплывалі чуткі пра незвычайнае афармленне сцэны. І сапраўды, сцэнаграфія Б.Герлавана ўражвала. Значную частку плошчы сцэны займаў самы сапраўдны басейн, вада з якога на вачах здзіўленых гледачоў часам з шумам спадае некуды ў нетры тэатра. Аднак незвычайная дэкарацыя адначасова стала і адным з слабых месцаў спек-такля. Сцэнаграфія павінна быць абумоўлена логікай спек-такля, быць неад’емнай часткай відовішча. У дадзеным жа выпадку цікавая знаходка не працавала на раскрыццё ідэі спектакля, а толькі выступала ў якасці кідкай упакоўкі [1].
Увогуле, дзеянне спектакля развівалася вельмі паволь-на, і значны час спатрэбіўся, каб зразумець, у чым сэнс таго, што адбываецца на сцэне. Засталося незразумелым, чаму і дзеля чаго рэжысёр абраў менавіта гэты твор А.Стрындберга. З аднаго боку, гэтай гістарычнай драме не стае пэўнай эпічнасці, з другога – вастрыні і глыбіні рас-крыцця характараў. Гэта нявызначанасць сталася відавоч-най і ў ігры акцёраў: кожны з іх стварыў па-свойму цікавы вобраз, але разам яны не склаліся ў нешта цэласнае і вы-разнае [1].
Да 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысц-кіх захопнікаў у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я.Купалы быў пастаўлены спектакль *“Балада пра кахан-не”* паводле аповесці В.Быкава “Альпійская балада”. Па-становку ажыццявіў У.Савіцкі. У адрозненне ад перша-асновы, дзе драматызм твора будуецца на рэзкім кантрасце паміж натуральнасцю, прыгажосцю прыроды і жахлівас-цю, дзікасцю вайны, – менавіта відавочнасць гэткага дыса-нансу і абуджае ў героях незабітыя, чалавечыя пачуцці, – у спектаклі У.Савіцкага прыроднае буйства Альпаў замя-няюць ... драўляныя зэдлікі. Абсалютна аднолькавыя на першы погляд, яны змаглі перадаць тое, што за ўсёй гэтай знешняй уніфікаванасцю і аднолькавасцю стаяць скалеча-ныя і знявечаныя чалавечыя лёсы.
Выбар на ролі Джуліі і Івана маладых купалаўскіх акцёраў Г.Хітрык і Р.Падалякі стаўся сапраўдным тэат-ральным адкрыццём. У дадзеным спектаклі яны ці не ўпершыню для сябе прадсталі ў ролях “несучаснікаў”, людзей з “той” вайны. Артысты здолелі зрабіць іх блізкімі, нават роднымі нам, – найперш шчырасцю перажыванняў і тонкасцю ўзаемаадносін, якія ўзнікаюць паміж іх героямі [20].
6 верасня 2003 г. у рамках святкавання Дня беларус-кага пісьменства ў г.Полацку быў адкрыты філіял *Нацыя-нальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я.Кола-са.* Аматарам тэатральнага мастацтва

была прадстаўлена гістарычная меладрама А.Курэйчыка *"П'емонцкі звер"* у пастаноўцы Ю.Лізянгевіча.
8 кастрычніка 2003 г. на сцэне Коласаўскага тэатра ад-быўся прэм'ерны паказ гэтага спектакля. На думку крыты-ка Н.Бунцэвіч, п'есы А.Курэйчыка часта лепей чытаюцца, чым глядзяцца. Цікавыя сюжэтныя павароты і чалавечыя характары, здараецца, бываюць фрагментарнымі, пазбаўле-нымі лагічнага працягу. Штосьці часткова "праецыруецца" на пэўныя драматургічныя вытокі: п'еса аказваецца сабра-най з арыгінальна, па-свойму адаптаваных, "правобразаў". Творы часта маюць пазнавальны характар: гістарычныя, біблейскія факты набываюць у іх запамінальную аўтар-скую "расшыфроўку". У выніку сама сабой нараджаецца паралель с традыцыямі беларускага XVIII стагоддзя – най-перш, з драматургіяй школьнага тэатра.
Сцэнаграфія Р.Лядэнкі у спектаклі "П'емонцкі звер", пры ўсёй сваёй адпаведнасці вобразнай і сэнсавай атмасфе-ры спектакля, вымушае ўзгадаць мяжу 1970–80-х гг., калі на змену "рэалістычным" відарысна-інтэр'ерным замалёў-кам прыйшлі абагульнена-філасофскія сімвалы – тыя ж "вяроўкі", якіх заўсёды было багата ў гістарычных спек-таклях. Вертыкальныя вяроўкі–канаты ўспрымаюцца як сімвал духоўнай няволі, як вобразнае злучэнне верху і ні-зу, зямнога і нябеснага. Аднак сёння хацелася б не толькі прамых асацыяцый, але і нейкага новага, нечаканага ра-шэння. Рэжысура Ю.Лізянгевіча, як лічыць Н.Бунцэвіч, не вельмі схіляе да асацыяцый і роздуму. Часам здаецца, што акцёры проста не ведаюць, што ім рабіць з тэкстам, як яго сэнсава інтэрпрэтаваць.
Уражвае музыка У.Кандрусевіча – вельмі эмацыяналь-ная і максімальна дакладная. У спектаклі яна становіцца не дадатковым выразным сродкам, а галоўным стрыжнем, які трымае вакол сябе ўсё астатняе [7].
15 кастрычніка 2003 г. у тэатры адбылася прэм'ера спектакля *"Жанчына ў пясках"* па п'есе Коба Абэ. Рэ-жысёр спектакля І.Баярынцаў.
8 лістапада 2003 г. гледачы змаглі ўбачыць прэм'еру спектакля *"Люцi"* па п'есе А.Дударава ў пастаноўцы М.Краснабаева.
14 сакавіка 2004 г. у Коласаўскім тэатры адбылася прэм'ера спектакля *"Бацька"* па драме А.Стрындберга ў пастаноўцы галоўнага рэжысёра тэатра В.Баркоўскага. У цэтры п'есы – складаны сямейны канфлікт, карані якога ў далёкім мінулым. Аднак там, дзе А.Стрындберг абвінавач-вае персанажаў, што пайшлі на кампраміс са сваім сумлен-нем, рэжысёр апраўдвае іх, праводзіць іншую, адрозную ад аўтарскай канцэпцыі думку: адсутнасць любові, паразумен-ня між людзьмі спараджае зло. Гэта выдатна пададзена ў спектаклі найперш праз сцэнічную атмасферу; знойдзеная рэжысёрам сімволіка ўзмацняе

ўздзеянне драматургічнага матэрыялу [17].
З псіхалагічнай перакананасцю выконваюць свае ролі С.Акружная (Лаура), В.Салаўёў (Адольф), В.Петрачкова (Карміліца) і інш.

5 кастрычніка 2003 г. у *Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М.Горкага* адбылася прэм'ера спектакля *"Утешитель вдов"* па п'есе Дж.Марота і Б.Ран-доне ў пастаноўцы В.Грыгалюнаса.
15 снежня 2003 г. у рамках Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Религиозный диалог и примирение через искусство" ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М.Горкага адбылася прэм'ера спектакля *"Изве-щение Марии"* па п'есе П.Кладэля ў пастаноўцы галоўнага рэжысёра тэатра Б.Луцэнкі.
6 лютага 2004 г. на сцэне тэатра прайшоў прэм'ерны паказ спектакля *"Анджело и другие"* па творах А.С.Пушкі-на. Рэжысёр спектакля Б.Луцэнка.
1 красавіка 2004 г. у тэатры адбылася прэм'ера спек-такля *"Детектор лжи"* па п'есе В.Сігарава. Рэжысёр па-станоўкі П.Харланчук. Аб прывабна-актуальных адметнас-цях пастаноўкі шмат гаварылі яшчэ да яе з'яўлення. Па-першае, гэты спектакль – першая беларуская пастаноўка п'есы аднаго з модных маладых расійскіх драматургаў. У свае 27 гадоў В.Сігараў адзначаны такімі прэстыжнымі прэміямі, як "Дэбют", "Антибукер" ,"Эврика" ,"Новый стиль" і інш. Па-другое, цікавасць да пастаноўкі была вы-клікана асобай маладога рэжысёра-пастаноўшчыка спек-такля і акцёра П.Харланчука, які зусім нядаўна ўліўся ў трупу тэатра, але творчасць якога ўжо пэўны час прыцяг-вае ўвагу тэатральных крытыкаў, якія прагназуюць яму цікавую творчую будучыню.
Працягваючы антрэпрызныя традыцыі, акцёры тэатра В.Клебановіч (Надзея), Я.Лявонцьеў (Барыс) і Аляксандр Ткачонак (Гіпнатызёр) ствараюць яркія і "самаграючыя" вобразы "постсавецкіх" грамадзян. І камедыйныя сітуацыі, накладваючыся адна на адну, ператвараюць сцэнічнае дзейства ў "камяк" фарсавых напластаванняў. Аднак пры ўсім жаданні "пасмяшыць публіку" рэжысёр не забываецца пра адно: для яго героі спектакля – мілыя і добрыя людзі, з якіх можна, канешне, пасмяяцца, але ў якіх можна і павучыцца – шчырасці пачуццяў, дабрыні і любові [23].

11 кастрычніка 2003 г. у *Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі* адбыўся прэм'ерны паказ спектак-ля *"І рэха адказала – ты"* па п'есе А.Карэліна ў паста-ноўцы В.Ласоўскага.

Цікавасць да прэм’еры была абумоўлена, перш за ўсё, асобай аўтара п’есы – маладога драматурга А.Карэліна. Дарэчы, менавіта за п’есу “Лафантэн, альбо Белая кашуля з чорным каўняром” ён атрымаў другую прэмію на IV Рэс-публіканскім конкурсе п’ес для тэатра. Жанр пастаноўкі быў вызначаны як “дэтэктыў плюс...”. Думаецца, гэта быў своеасаблівы рэкламны ход, каб прывабіць гледачоў, бо ў спектаклі прысутнічалі толькі паасобныя элементы дэтэк-тыву, і твор з поўным правам можна назваць меладрамай. Дзякуючы драматургу, пастаноўка мае імклівы тэмп раз-віцця падзей з першых хвілін, аднак, на жаль, фінал гіс-торыі значна саступае шматабяцальнаму пачатку: страчва-ецца тэмп, адсутнічае моцная завяршальная кропка [5].

Праблемы драматургіі закранулі і спектакль. Так, рэ-жысёр, занадта захапіўшыся цікавай сюжэтнай лініяй, не надаў адпаведнай увагі распрацоўцы характараў персана-жаў. А паколькі ў п’есе яны таксама толькі акрэслены, гэта адметна адбілася на пастаноўцы. Вобразы, створаныя акцёрамі, не вызначаюцца глыбінёй. Пэўная спрошчанасць уласціва і паказу пачуццяў герояў, якія часам выглядаюць ненатуральнымі. Усё гэта прывяло да таго, што на знешнім узроўні дзеянне перагружана падзеямі, а ўнутраны свет кожнага з герояў застаецца амаль нязменным.

Аднак, нягледзячы на ўсё вышэйпералічанае, думаец-ца, што спектакль будзе мець свайго гледача, – дзякуючы, перш за ўсё, добра “закручанаму” сюжэту і цікавай інтры-зе [5].

26 снежня 2003 г. у тэатры адбылася прэм’ера мюзік-ла-пародыі *“Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвей”* па п’есе У.Аксянкруга. Рэжысёр пастаноўкі С.Кавальчык.

5 мая 2004 г. на сцэне тэатра адбыўся прэм’ерны паказ спектакля *“П’емонцкі звер”* па п’есе А.Курэйчыка ў паста-ноўцы галоўнага рэжысёра В.Анісенкі.

Супрацоўніцтва РТБД з А.Курэйчыкам стала для тэат-ра не толькі цікавым, а і плённым: так, спектакль “Спо-ведзь Пілата” і сёння выклікае цікавасць у гледача.

В.Анісенка пры пастаноўцы твораў гэтага драматурга не спрабуе выцягнуць з іх нейкую глыбінную філасофію, як гэта робяць іншыя пастаноўшчыкі, заблытваючыся ў акалічнасцях і матывіроўках.

В.Анісенка на першы план ставіць саму гісторыю. І, прачытваючы яе гранічна проста, без дадатковых псеўдафіласофскіх “упрыгожванняў”, ад-крывае нам іншы пласт філасофіі – гармоніі і ўзаемасувязі ўсяго ў свеце.

Спектакль дэманструе нам яркія і цікавыя акцёрскія работы, сярод якіх

можна адзначыць Л.Сідаркевіч (Ізабэла П'емонцкая), Г.Чарнабаеву (Маці-Ігумення), Т.Мархель (Урбена), І.Сігова (Рыцар Жафрэй) і інш. Перад намі най-перш бачыцца цудоўна сыграны ансамбль, які пакарае зладжанасцю і адчуваннем адзін аднаго на сцэне [26].
Асноўным напрамкам дзейнасці тэатра мастацкі кіраў-нік В.Анісенка лічыць працу з творамі маладой беларускай драматургіі. Але для таго, каб выжыць у сучасных экана-мічных умовах, тэатр будзе браць і творы замежнай драма-тургіі (і іграць іх на беларускай мове). "Пракатны бок" тэатр будзе рабіць з больш прадуманых, выверaных назваў. 2–4 такіх спектаклі дадуць магчымасць зарабіць пэўную колькасць грошай, якія пойдуць на патрэбы тэатра. У пла-нах тэатра – адкрыццё малой сцэны, павелічэнне колькасці "малафарматных" выязных спектакляў. Усё гэта павінна стымуляваць эканамічнае і творчае жыццё тэатра [6].

19 снежня 2003 г. у *Дзяржаўным маладзёжным тэат-ры* адбылася прэм'ера спектакля *"Крылья"*. П'есу паводле твора Г.Маркеса "Старый сеньор с огромными крыльями" напісаў А.Курэйчык. Пастаноўка В.Тарнаўскайтэ.
У студзені 2004 г. на сцэне тэатра быў паказаны прэм'ерны спектакль *"Хитроумная влюбленная"* па п'есе Лопэ дэ Вега. Рэжысёр спектакля І.Малаў.
Як вядома, у тэатры пэўны час доўжыўся складаны ўнутраны канфлікт, вынікам якога стаў адыход са сваёй пасады галоўнага рэжысёра В.Катавіцкага. З новага сезона гэту пасаду займае М.Абрамаў. Першай пастаноўкай нова-га галоўнага рэжысёра стаў спектакль *"Акадэмія смеху"* паводле п'есы японскага драматурга Кокі Мітані. Спек-такль можна назваць своеасаблівай "візітоўкай" новага курса Дзяржаўнага маладзёжнага тэатра. Пры гэтым уба-чанае сведчыць, што новы галоўны рэжысёр робіць стаўку на "класічны", акадэмічны тэатр. Спектакль адзначаецца бліскучай акцёрскай ігрой "зорак" Маладзёжнага тэатра: "мэтра", улюбёнца прыхільнікаў антрэпрызы С.Жураўля і маладога таленавітага акцёра І.Чарапко [19].
Як лічыць дырэктар *Новага драматычнага тэатра* г.Мінска (былы Мінскі драматычны тэатр "Дзе–Я?") В.Марцэцкі, сезон 2003/2004 г. быў для тэатра паспяхо-вым, плённым і цікавым. Адбыліся прэм'еры спектакляў *"Бешеные деньги"* па п'есе А.Астроўскага (рэжысёр А.Гар-цуеў), *"Квадратура круга"* В.Катаева (рэжысёр І.Пятроў), *"Позвольте надеяться"* паводле вадэвіля У.Салагуба "Беда от нежного сердца" (рэжысёр Б.Утораў). Да 60-годдзя вы-звалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў мала-ды рэжысёр, выпускнік Беларускай

дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Д.Нупрэйчык паставіў спектакль *“Не бойся быть счастливым”* паводле п’есы А.Арбузава “Мой бедный Марат”. Увогуле, у гэтым сезоне ў тэатр прыйшло шмат моладзі, што дапамагло стварыць добры рэпертуар, бо без маладых выканаўцаў пастаноўка ўсіх вышэйзгаданых спектакляў была б немагчымай.
Ужо гатовы праект рэканструкцыі будынка тэатра, які прадугледжвае трохпавярховую прыбудову с тыльнага бо-ку, куды перамесцяцца службы тэатра. Трэці паверх зойме Дзіцячая тэатральная школа, якая сёння месціцца ў дзвюх аўдыторыях. Адкрыецца другая зала з традыцыйнай тэат-ральнай сцэнай і мяккімі крэсламі, разлічаная на 160–180 месцаў.
Нягледячы на тое, што ў тэатра няма мастацкага кіраў-ніка, калектыў мае перад сабой пэўныя творчыя перспек-тывы. Афіша тэатра  сведчыць аб тым, што калектыў ба-чыць свой шлях, бо тут ідуць тыя спектаклі, якіх няма ні ў адным іншым тэатры краіны.
Да наступнага сезона рэжысёр Д.Нупрэйчык пачаў пра-цу над п’есай А.Макаёнка *“Зацюканы апостал”*. Рэжысёр атрымаў ад Міністэрства культуры грант на гэту пастаноў-ку, выйграўшы конкурс рэжысёрскіх эксплікацый. Рэжы-сёр І.Пятроў, які таксама перамог у гэтым конкурсе, выра-шыў ставіць *“Профессию миссис Уоррен”* Б.Шоу менавіта ў гэтым тэатры. Атрымалася, што з 5 грантаў на рэспубліку, якія сёлета выдала Міністэрства культуры, два прыйшліся на Новы драматычны тэатр [9].
Як падкрэслівае кіраўнік літаратурна-драматычнай ча-сткі тэатра Л.Лявонава, тэатр не адмаўляецца ад тых ідэй і той першаасновы, якая была закладзена заснавальнікам тэатра “Дзе–Я?” М.Труханам: паказаць беларусу беларуса, паказаць менталітэт і гісторыю нашага народа, яго карані. Разам з тым сёння тэатр ужо іншы. Да таго ж і ў рэпер-туары, які раней быў толькі беларускамоўны, з’явіліся спектаклі на рускай мове. Але тэатр папаўняе рэпертуар і творамі на беларускай мове, актыўна супрацоўнічае з айчыннымі драматургамі. Напрыклад, у мінулым сезоне была пастаўлена п’еса Г.Марчука *“Чай з вярблюдам”*, пе-рад гэтым тэатр паставіў казку П.Васючэнкі *“Новы Кала-бок”* (пад назвай *“Новыя прыгоды старых знаёмых”*). Ёсць прапановы пастановак твораў В.Жуковіча, А.Дзялендзіка і інш. Таму можна сказаць, што ў галоўным Новы драма-тычны тэатр працягвае традыцыі тэатра “Дзе–Я?”, бо сваёй асноўнай задачай бачыць прапаганду беларускай культуры [28].

4 кастрычніка 2003 г. у *Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача* адбылася прэм’ера спектакля *“По-лианна”* па аповесці Э.Портер. Рэжысёры І.Сідорчык і Г.Сапегін.

15 кастрычніка 2003 г. на сцэне тэатра адбыўся прэм'ерны паказ спектакля *"Последняя дуэль"* аб жыцці і творчасці А.С.Пушкіна ў рэжысуры Н.Башавай.
23 снежня 2003 г. у Тэатры юнага гледача адбылася прэм'ера казкі *"Новогодние сны Золушки"*. Рэжысёр паста-ноўкі Ю.Вута.
18 і 19 лютага 2004 г. у тэатры прайшлі прэм'ерныя паказы спектакля *"Тарас на Парнасе"* па п'есе С.Кавалёва ў пастаноўцы Н.Башавай. Спектакль выклікаў зацікаўле-насць як гледачоў, так і крытыкаў. Першыя былі ў захап-ленні ад яркай эпатажнай пастаноўкі Н.Башавай. Другія ж успрынялі спектакль неадназначна, наконт яго выказвалі-ся самыя розныя думкі. Высветліць сітацыю павінна была канферэнцыя з удзелам акцёраў, гледачоў і прафесійных крытыкаў, наладжаная сумеснымі намаганнямі Міністэр-ства культуры і ТЮГа. Выступоўцы адзначалі, што галоў-ная мэта гэтага спектакля – зрабіць стаўку на відовішч-насць, прывабіць у тэатр гледача. Стаўка на знешнюю пры-вабнасць сябе апраўдала, бо пераважная большасць гледа-чоў цалкам прыняла спектакль. Падчас абмеркавання адзна-чаліся і акцёрскія працы, і рэжысура, і цікавы сучасны падыход да класічнага твора. Крытыкі, сярод якіх былі доктар мастацтвазнаўства А.Сабалеўскі, доктар філасоф-скіх навук В.Салееў, тэатральны крытык Т.Команава, адзначалі як вартасці, так і недахопы спектакля.
Падобныя імпрэзы-абмеркаванні – гэта, сродак "зварот-най сувязі" з глядзельнай залай, і добра, што кіраўніцтва тэатра разумее неабходнасць падобных сустрэч, якія трэба спадзявацца, стануць традыцыйнымі [4].
На думку крытыка Т.Команавай, сёння беларускі тэатр у пераважнай большасці сваёй прагназуемы: не толькі спецыялісты, але і звычайныя гледачы, прыходзячы ў тэ-атр, яшчэ да пачатку спектакля больш-менш выразна ўяў-ляюць тое, што праз некалькі хвілін адбудзецца на сцэне. Тэатр, імкнучыся не страціць гледача, прэзентуе на сцэне па магчымаці толькі спектаклі са стопрацэнтна праліча-ным і "вывераным" поспехам. Тэатральныя "неспадзяван-кі" сёння – надзвычайная рэдкасць. Да іх адносіцца і новы бліскучы спектакль ТЮГа *"Маленькія трагедыі"* паводле знакамітага твора А.Пушкіна ў пастаноўцы М.Лашыцкага [21]. Думаецца, сваёй асноўнай задачай рэжысёр бачыў ме-навіта актуалізацыю пушкінскай драматургіі. Не сакрэт, што нават такая "бясспрэчная" класіка ўспрымаецца сёння шмат у чым за ўзор "той" літаратуры, "таго" тэатра, "той" эстэтыкі – стагоддзі існавання паспрыялі таму, што на гэ-тых творах утварыліся пэўныя "напластаванні" традыцый і стэрэатыпаў сцэнічнага прачытання знакамітых пушкін-скіх вобразаў. Але М.Лашыцкага "традыцыі" гэтыя не займаюць, для яго

актуалізацыя класікі – гэта не перай-начванне пушкінскага тэксту, а паглыбленне ў сутнасць тых гісторый, якія апісвае класік, выкрышталізацыя “веч-ных сюжэтаў”. І менавіта дзякуючы такому “заглыбленню ў матэрыял”, вядомыя кожнаму пушкінскія гісторыі набы-ваюць надзвычайную свежасць, лёгкасць і пранізлівасць. Захопленасць вызывае жывая і яркая ігра акцёраў: А.Паплаўскай, Н.Гарбацэнка, А.Станілевіча, А.Палазкова, І.Сідорчыка, І.Ушакевіча, Т.Жданавай і, вядома ж, “зоркі” спектакля Л.Улашчанкі.
Наўрад ці можна перадаць словамі тую гаму пачуццяў, што агортваюць гледача падчас спектакля, яго дзейсная насычанасць выклікае шчырае захапленне. Як, зрэшты, захапленне выклікае і тое, што сёння на беларускай сцэне з нашымі беларускімі акцёрамі аказалася магчымым паста-віць цікавы, глыбокі і прадуманы спектакль-эксперымент, так не падобны на іншыя [21].

1 ліпеня 2004 г., напярэдадні 60-годдзя вызвалення Бе-ларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у *Тэатры-сту-дыі кінаакцёра* адбылася прэм’ера спектакля *“Навечна ў памяці”* (рэжысёры А.Бяспалы і У.Грыцэўскі). У пастаноў-цы, жанр якой самі стваральнікі пазначаюць як кінаспек-такль, найлепшым чынам спалучаюцца кіно і музыка, про-за і паэзія. Рэжысёры-пастаноўшчыкі адзначалі, што не ставілі мэты зрабіць нейкія вялікія адкрыцці, а проста паспрабавалі прасачыць за падзеямі вайны ад пачатку да канца, паказаць герояў, якія перамаглі ў гэтай вайне і выратавалі свет ад нацызму. Спектакль рабіўся для таго, каб разбудзіць, растрывожыць чалавечую памяць, бо мы не павінны забывацца на сваё мінулае. У спектакль уключаны менавіта старонкі тых твораў, якія пакінулі значны след, былі шырокавядомыя ў народзе: “Альпійская балада“ ,”Дзяржаўная мяжа“ ,”Гадзіннік спыніўся апоўначы”, так-сама фрагменты з дакументальных фільмаў. Спектакль імкнуўся паказаць, што вайна перамолвала ўсё на свеце, але ж людзі праходзілі праз усе яе жахі і заставаліся людзьмі. І гэта – цуд [8].

24 чэрвеня 2004 г. на сцэне сталічнага Дома афіцэраў адбылася прэм’ера спекаткля *“Ты помніш, Алёша...”* па п’есе А.Дударава ў пастаноўцы М.Дударавай – “першая ластаўка” новага *Драматычнага тэатра Беларускай ар-міі*. Вядомы драматург з’яўляецца і мастацкім кіраўніком гэтага тэатра. Пры тэатры створана мастацкая рада – невя-лікая, але дзейсная. Па словах А.Дударава, у сваёй дзей-насці тэатр будзе прытрымлівацца традыцыйных форм, пра ўсё будзе казаць сур’ёзна, глыбока і зразумела. У планах тэатра – пастаноўка п’ес *“Рамэо і*

*Джульета”* У.Шэкспіра, *“Вечар”* А.Дударава. Дарэчы, калі гаварыць пра рэпертуар-ную палітыку новага тэатра, то трэба мець на ўвазе, што тэатр не будзе паказваць на сцэне толькі “людзей у паго-нах”. Задача тэатра – гаварыць са сцэны людзям пра веч-ныя і неперахoдныя ісціны: пра веру, любоў, Радзіму, Бога, пра адносіны да дзяцей, бацькоў, родных, якіх мы павінны паважаць і шанаваць. Нягледзечы на ўсю нашу рознасць, існуюць агульныя кропкі сутыкнення, у якіх нашы жыццёвыя імкненні сыходзяцца. Вось пра гэта тэатр і будзе весці гаворку з гледачамі [15, 16].

У сезон 2003/2004 г. *Мінскі абласны драматычны тэ-атр* (г.Маладзечна) прыйшоў з пэўнымі зменамі: з’явіўся новы мастацкі кіраўнік В.Ласоўскі; акцёры А.Барткевіч і Я.Іўковіч паступілі ў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў на рэжысёрскі факультэт, а А.Карпец – на фа-культэт акцёрскага майстэрства.
Новы сезон тэатр адкрыў дзвюма прэм’ерамі. 5 каст-рычніка 2003 г. святло рампы ўбачыў спектакль *“Мамаша Кураж і яе дзеці”* па п’есе Б.Брэхта. Пад кіраўніцтвам рэ-жысёра А.Барткевіча ў спектаклі працуе ўся трупа, а га-лоўную ролю выконвае майстар сцэны А.Рахмангулава. Значную дапамогу ў пастаноўцы спектакля аказаў кансуль-тант Р.Баравік.
24 кастрычніка 2003 г. на сцэне тэатра адбылася прэм’ера спектакля *“Нязваны госць”* па п’есе С.Бартохавай у пастаноўцы В.Ласоўскага. Гэта гісторыя пра тое, як лю-дзі зноў знайшлі адзін аднаго і прыйшлі да вяршыні ка-хання праз многа гадоў сумеснага жыцця. У спектаклі занятыя артысты А.Чэчанеў і Л.Рошчына.
Яшчэ да адкрыцця сезона тэатр гастраліраваў па Мінскай вобласці, а 26 верасня ўпершыню на сцэне ТЮГа быў паказаны спектакль *“Папялушка”* па казцы Я.Шварца ў пастаноўцы Ю.Вуты, прыхільна сустрэты маленькімі гледачамі [40].
22 лістапада 2003 г. гледачы змаглі ўбачыць прэм’еру спектакля *“Месье с рогами, мадам с усами”* ў пастаноўцы Ю.Вуты.
20 лютага 2004 г. у Мінскім абласным драматычным тэатры адбылася прэм’ера спектакля “*Люці*” па творы А.Дударава. Рэжысёр пастаноўкі В.Мурычын.
28 красавіка 2004 г. у тэатры адбылася прэм’ера ра-мантычнай камедыі *“Вясёлы Роджэр”* па п’есе Д.Салімзя-нава ў пастаноўцы В.Мурычына.
16 мая 2004 г. тэатр запрасіў гледачоў на прэм’еру казкі–гульні *“Кошкі-мышкі”* па матывах п’есы А.Хайта “Дзень нараджэння ката Леапольда” ў пастаноўцы В.Ла-соўскага.

Аналізуючы мінулы сезон (2003/2004 г.) у *Брэсцкім абласным таэтры драмы і музыкі*, загадчык літаратурнай часткі А.Грышына найперш выдзяляе гастрольную дзей-насць, якая была асабліва актыўнай. Першая прэм'ера сезона, сумесны праект з берлінскім тэатрам "Сталічны" – спектакль *"Клоп"* паводле твора У.Маякоўскага –адбылася спачатку ў Літве, потым і ў Берліне. Пэўнай вяхой у гісто-рыі тэатра сталі і гастролі ў Маскве, дзе апошні раз тэатр быў у 1980-я гады. Гастролі прайшлі найлепшым чынам, тэатр атрымаў шмат станоўчых водгукаў на спектаклі ў сродках масавай інфармацыі. Сур'ёзным іспытам для тэат-ра сталі і гастролі ў Мінску, якія таксама прайшлі паспя-хова.
Працягваюцца пошукі новых шляхоў у працы па ажыццяўленню рэпертуарнай палітыкі тэатра. Так, акрамя сумеснага праекта з берлінскім тэатрам, быў здзейснены сумесны праект з польскім інстытутам у г.Мінску: 12 снежня 2003 г. у Брэсцкім абласным тэатры драмы і музыкі адбылася прэм'ера спектакля *"Портной"* па п'есе С.Мрожака ў пастаноўцы польскага рэжысёра Ц.Карпінь-скага. Спектакль класіка еўрапейскай драматургіі абсурду ў выкананні брэсцкіх артыстаў трансфармаваўся ў свое-асаблівы "містыцызм", выявіўшы логіку рэчаў, на першы погляд, алагічных, і еднасць паняццяў нібыта несумя-шчальных.
8 студзеня 2004 г. у тэатры прайшла прэм'ера спек-такля *"С любовью не шутят"* паводле п'есы Альфрэда дэ Мюсэ. Рэжысёр спектакля Ц.Ільеўскі.
25 красавіка 2004 г. на сцэне тэатра адбылася прэм'ера спектакля *"Смешанные чувства"* ў пастаноўцы С.Еўдашэн-кі.
Да заканчэння сезона была практычна падрыхтавана пастаноўка спектакля з рабочай назвай *"В объятиях Мель-помены"* па п'есе М.Булгакава "Сумасшедший Журден". Пастаноўшчык спектакля – украінскі рэжысёр А.Бакіраў, для якога гэта ўжо трэцяя праца ў брэсцкім тэатры [9].

23 верасня 2003 г. у *Гомельскім абласным драматыч-ным тэатры* прайшла прэм'ера спектакля *"Рядовые"* па п'есе А.Дударава ў пастаноўцы В.Раеўскага. Пастаноўка была прысвечана 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямец-ка-фашысцкіх захопнікаў. Гомельскі спектакль нельга на-зваць проста пераносам вядомай купалаўскай пастаноўкі дваццацігадовай даўнасці, таму што паўтарыць той поспех – задача надзвычай складаная: змяніліся час, соцыум, каш-тоўнасныя крытэрыі. У новай пастаноўцы В.Раеўскага сэн-савыя акцэнты змяніліся ў бок пошуку "крытэрыяў" для ацэнкі маральных узаемаадносін паміж

людзьмі.
Можна сказаць, што гомельскі спектакль у адным “паўтарыў” купалаўскі: гледачы успрымаюць яго з надзвы-чайнай цеплынёй, сведчаннем чаму і поўныя залы ў род-ным тэатры, і прэстыжныя вышэйшыя ўзнагароды на між-народных тэатральных фестывалях. Раней мы цвёрда ведалі, што савецкі салдат – самы велічны і непераможны ў свеце, гэта была аксіёма. А спек-такль паказаў іх нам звычайнымі людзьмі са сваімі праб-лемамі, клопатамі, характарамі.
Сёння ў часы, калі, не ваюючы, мы з’яўляемся сведкамі войнаў, многія з якіх часта маюць і эканамічна-“камерцыйную” падаплёку, рэ-жысёр спрабуе вярнуць абаронцам сваёй радзімы іх гордае імя – і сказаць сучаснаму пакаленню, што існуюць на свеце каштоўнасці, якія нельга вымяраць з дапамогай гро-шай. Гэта – сумленне, адданасць, вера, каханне...
Кожны з выканаўцаў намагаецца адшукаць у сваім персанажы штосьці індывідуальнае, глыбока асабістае, і, у той жа час, узняцца да ўзроўню вобразаў – сімвалаў. Асаб-ліва вылучаецца ў спектаклі акцёрскае трыо: Дугін (В. Чэ-пелеў), Бушцец (А.Караткевіч) і Дзерваед (А.Бычкоў).
Выдатныя акцёрскія работы, зладжаны ансамбль, яр-кая і вобразная сцэнаграфія, а галоўнае – высокі грама-дзянскі патрыятызм, любоў да свайго народа, – усё гэта вызначае сімпатыі і прыхільнасць глядацкай залы.
Фінальная сцэна спектакля гучыць наказам іншым па-каленням, якія, на шчасце, не сутыкнуліся с жахлівай на-валай, але, на жаль, часам забываюцца, што ўсё тое можа стаць рэальнасцю і сёння [25].
15 кастрычніка 2003 г. на сцэне тэатра адбылася прэм’ера спектакля *“Любовь в стиле барокко”* па п’есе Я.Стэльмаха ў пастаноўцы С.Кавальчыка.
29 лістапада 2003 г. у тэатры прайшла прэм’ера спек-такля *“Любовь – книга золотая”* паводле твора А.Талстога ў пастаноўцы Я.Натапава.
25 снежня 2003 г. на сцэне Гомельскага абласнога драматычнага тэатра адбылася прэм’ера казкі А.Гаруна *“Волшебная скрипка”* ў пастаноўцы С.Кавальчыка.
30 студзеня 2004 г. тэатр паказаў прэм’ерны спектакль *“Переполох”* па п’есе В.Ткачова (рэжысёр–пастаноўшчык Р.Баравік). Твор гэта не новы (ранейшая яго назва “Шкир-дюки занимают оборону”), але ў новай аўтарскай і рэжы-сёрскай рэдакцыі і інтэрпрэтацыі. Перад намі – камедыя, сатканая з анекдатычных сітуацый, якая не мае лагічна і паслядоўна пабудаванага сюжэта. Яна больш заснавана на рэпрызах смяхотнага характару – калі і сапраўды вострых, дасціпных, а калі і не

асабліва высокага гатунку. Перава-жаюць першыя, і гэтым твор мае мастацкую каштоўнасць.
Рэжысёр-пастаноўшчык Р.Баравік з мазаічных драма-тургічных кавалкаў выбудоўвае яркае тэатральнае відові-шча. У ім няма месца побытава-псіхалагічнай верагоднасці і дакладнасці – на сцэнічны прастор выплёскваецца буйная фантазія. І акцёры актыўна і з чыстай непасрэднасцю пад-трымліваюць гэту тэатральную гульню.
У спектаклі неаднойчы выкарыстоўваецца такі рэжы-сёрскі прыём, калі бурны рытм спектакля прыпыняецца, і на прасцэніум выходзіць галоўны герой, які звяртаецца непасрэдна да гледача са словамі болі і трывогі за нас, за тых, хто не заўсёды ўмее выбраць сабе годную дарогу ў жыцці [34].
26–27 сакавіка 2004 г. у Гомельскім абласным драма-тычным тэатры ў рамках святкавання Міжнароднага дня тэатра адбылася прэм’ера спектакля *“Цилиндр”* па п’есе Э. дэ Філіпа ў пастаноўцы Я.Натапава.
4 мая 2004 г. на сцэне тэатра прайшоў паказ прэм’ер-нага спектакля *“Горячее сердце”* па п’есе А.Астроўскага ў пастаноўцы Б.Арлоўскага.
4 чэрвеня 2004 г. гледачам была прадстаўлена прэм’ера спектакля *“Без вины виноватые”* па п’есе А.Астроўскага. Рэжысёр спектакля Л.Манакова.
Дарэчы, на думку рэжысёра С.Кавальчыка, Гомель можна лічыць другім тэатральным цэнтрам краіны. Безу-моўна, дзякуючы намаганням дырэктара Гомельскага абласнога драматычнага тэатра В. Рагоўскай гэты калек-тыў знаходзіцца ў выдатнай творчай форме, акцёры шмат іграюць, на пастаноўкі запрашаюцца цікавыя рэжысёры. Можна сказаць, што сёння гомельскі тэатр працуе прак-тычна па-еўрапейску: запрошаны рэжысёр мае для працы месяц, і за гэты месяц, калі ён жадае працаваць з гэтым тэатрам, павінен паставіць не “халтуру”, а дабротны, паў-навартасны спектакль [9].

13 кастрычніка 2003 г. у *Гомельскім маладзёжным эксперыментальным тэатры-студыі* адбылася прэм’ера спектакля *“Очень простая история”* па п’есе М.Лаго ў пастаноўцы В.Бартосіка.
5 снежня 2003 г. у тэатры адбылася прэм’ера спек-такля *“Студентка”* па твору Д.Мэмета. Рэжысёр Г.Муш-перт.
У студзені 2004 г. адбылася прэм’ера спектакля *“Я тоже была, прохожий”* паводле твораў М.Цвятаевай. Рэ-жысёр і выканаўца Г.Анчышкіна.
27 сакавіка 2004 г. на сцэне тэатра-студыі адбылася прэм’ера трагікамедыі *“Мораль пани Дульской”* па п’есе Г.Запольскай у пастаноўцы Г.Анчышкінай.

15 мая 2004 г. Маладзёжны тэатр-студыя прадставіў гледачам прэм’еру спектакля *“Дурацкие предложения”* па творах А.П.Чэхава і В.Алена. Рэжысёр Я.Натапаў.

18 кастрычніка 2003 г. у *Гродзенскім абласным дра-матычным тэатры* прайшла прэм’ера спектакля *“Мёрт-вае цела”* па п’есе В.Карасёва ў пастаноўцы А.Глотава.
4 снежня 2003 г. на сцэне тэатра гледачы ўбачылі прэм’ерны паказ спектакля *“Тартюф”* па камедыі Ж.-Б.Мальера. Рэжысёр спектакля Р.Таліпаў.
23 снежня 2003 г. у тэатры адбылася прэм’ера спек-такля для дзяцей *“Чароўны дар”* у пастаноўцы В.Сакалоў-скага.
27 сакавіка 2004 г. на сцэне тэатра прайшоў прэм’ерны паказ спектакля *“Крокодил”* па п’есе Е.Корына. Рэжысёр Г.Мушперт.
У юбілейным 115-м сезоне *Магілеўскага абласнога драматычнага тэатра* тры новых спектаклі паставіў рэжысёр В.Куржалаў: *“Прыходзь ды ўводзь”* па п’есе Н.Птушкінай, *“Сляпы, храмы і старая дзяўчына”* па п’есе А.Нікалаі і *“Пакой смеху для адзінокага чалавека”* па п’есе А.Багаева. Пазнаёміцца з апошнім спектаклем да канца сезона давялося нешматлікім гледачам, паколькі ідзе ён на Малой сцэне. А пасля традыцыйнага трохдзённа-га прэм’ернага паказу, які выпаў на ўрачыстае святкаван-не Дня горада, тэатр фактчына закрыў сезон і паехаў на гастролі. Аднак нельга сказаць, што прэм’ера засталася незаўважанай. Наадварот, з прычыны сваёй незвычайнасці новы спектакль атрымаў дастаткова шырокі рэзананс.
*“Пакой смеху для адзінокага чалавека”* – першы спек-такль, які быў пастаўлены на Малой сцэне тэатра. Імя ма-ладога расійскага аўтара А.Багаева добра вядома ў тэат-ральных колах. Ён працуе ў рамках эстэтыкі мадэрну і постмадэрну і звяртаецца да злабадзённых пытанняў і праблем рэчаіснасці, незвычайна асвятляючы іх.
Героі яго п’ес існуюць ў нейкай “пабочнай” рэальнасці, што дазваляе аўтару акунуць іх у свет фантасмагорый і сноў – і ўжо скрозь гэту прызму А.Багаеў паказвае тыя моманты рэчаіснасці, што яго цікавяць. Такі падыход дазваляе часам раскрыць сутнасць закранутых праблем глыбей і ярчэй, чым гэта магчыма ў плыні рэалістычнай традыцыі.
Вялікай заслугай рэжысёра з’яўляецца стварэнне атма-сферы адлучанасці дзеяння, асаблівай мовы пастаноўкі. Артыст А.Палкін стварае вобраз чалавека моцнага, якога не хочацца крыўдзіць жалем. Мы проста сведкі трагедыі адзінокага чалавека, асабістая бяда якога і трагедыя – та-тальная адзінота ў свеце. Гэта трагедыя нават не асобнага

чалавека, а цэлай эпохі, якая не здолела ўтрымацца на нагах пасля краху каштоўнасных арыенціраў. І калі мае сэнс шкадаваць каго-небудзь, дык толькі саміх сябе, тых, хто аддае перавагу выдуманаму свету і забываецца на сапраўднае жыццё з сапраўднымі ідэаламі [30].
4 снежня 2003 г. на сцэне тэатра адбылася прэм’ера спектакля *“Легенда пра Машэку”* па п’есе С.Кавалёва ў пастаноўцы А.Гарцуева.
19 сакавіка 2004 г. у тэатры прайшла прэс-канферэн-цыя, на якой абмяркоўваліся праблемы тэатральнага мас-тацтва. Удзельнічалі ў ёй 11 магілёўскіх тэатральных ка-лектываў, 9 з якіх – самадзейныя.
23 красавіка 2004 г. тэатр паказаў гледачам новую яркую пастаноўку: спектакль *“Гэтыя вольныя матылькі”* паводле п’есы амерыканскага драматурга Л.Герша ў па-станоўцы У.Пятровіча. П’еса, напісаная ў часы ўзлёту суб-культуры хіпі, неаднойчы ставілася на сцэнах самых вя-домых тэатраў. Але ў магілёўскай пастаноўцы рэжысёр прынцыпова адмаўляецца ад агульнапрынятых трактовак, адаптуючы твор пад сучасныя жыццёвыя рэаліі і арыен-туючы яго, у першую чаргу, на маладзёжную аўдыторыю.
На першым плане пастаноўкі – гісторыя кахання га-лоўных герояў, але меладраматычная аснова спектакля настолькі гнуткая і падатлівая, што арганічна закранае мноства іншых праблем: узаемаадносіны бацькоў і дзяцей, свабода чалавека і націск соцыума, сутыкненне таленту і бяздарнасці, маралі і амаральнасці. Дастаткова жорсткія і натуралістычныя эпізоды спектакля пададзены з добрым пачуццём меры і апраўданы з пункта гледжання дынамікі дзеяння.
У спектаклі іграюць пераважна маладыя акцёры тэат-ра. Гэта першыя сур’ёзныя ролі Т.Шыбалавай і І.Лысенка (Джыл Тэнэр), Я.Максіменкі і М.Рама免ўскага (Дональд Бэйкер). Абодва акцёрскія склады спектакля самабытныя, і можна сказаць, што ў тэатры пад адной назвай ідуць два розныя спектаклі. Цікавыя вобразы стварылі артысты С.Кліменка, Л.Гурына, Р.Кушнер.
За даволі кароткі тэрмін жыцця спектакля вакол яго разгарэліся спрэчкі, узніклі розныя, часам палярныя мер-каванні. Гэта сведчыць аб тым, што спектакль надзённы і закрануў гледачоў за жывое. Часта гучыць парадаксальная думка аб тым, што гэта пастаноўка – не толькі для мола-дзі, колькі, наадварот, для старэйшага пакалення, якое ча-сам не вельмі цікавіцца і не вельмі добра ведае, чым жы-вуць і дыхаюць іх нашчадкі [38].

Як адзначае загадчыца літаратурнай часткі *Магілёў-скага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В.І.Дуніна-Марцінкевіча* (г.Бабруйск)

А.Грахава, тэатр хоць і лічыцца абласным, але працуе ў г.Бабруйску, таму сталічныя знаў-цы тэатральнага мастацтва тут госці рэдкія і пра жыццё правінцыяльнага тэатра мала што ведаюць [11].
У газеце “Культура” апублікаваны артыкул А.Грахавай “Наш тэатр любіць дзяцей!” (у сувязі з артыкулам Т.Кома-навай “Беларускія тэатры не любяць дзяцей?..”, які апуб-лікаваны ў газеце “Культура ,”2004, 28 жн. – 3 верас. (№ 35), с. 10). У ім аўтар распавядае пра тое, як тэатр у г.Бабруйску ставіцца да дзяцей, якія формы эстэтычнага выхавання тут выкарыстоўваюцца.
Па-першае, у тэатры існуюць традыцыйныя асенні і веснавы тыдні “Тэатр – дзецям”, да якога заўсёды рых-туецца новы спектакль. Так, у лістападзе 2003 г. у рамках Тыдня (26–30 лістапада) адбылася прэм’ера спектакля *“Красавица и чудовище”* ў пастаноўцы А.Жугжды. Гэтыя дні даюць магчымасць юным гледачам больш шчыльна па-знаёміцца з тэатрам: ладзяцца экскурсіі па тэатры і вы-стаўкі. У дзяцей узнікае шмат пытанняў, ім усё цікава, асабліва сцэна з новымі для іх паняццямі і словамі – ка-ласнікі, сафіты, авансцэна, кулісы...
Па-другое, праводзяцца навагоднія святы з Дзедам Марозам, Снягуркай і рознымі казачнымі персанажамі, з ёлкай, карагодамі і конкурсамі, прызамі, фотаздымкамі і цудамі. У тэатры нарадзіўся звычай – на працягу зімовых канікул дзеці ўдзельнічаюць у конкурсе малюнкаў да спектакля. Пераможцы маюць магчымасць наведваць усе дзіцячыя спектаклі да канца сезона.
Па-трэцяе, пастаянны паказ спектакляў ў летні перыяд у школьных лагерах і за горадам. Кожную сераду і суботу ў тэатры ідуць дзіцячыя спектаклі. Сярод іх ёсць спектаклі больш удалыя, ёсць менш удалыя. Сярод любімых казак у дзяцей – *“Крыштальны туфлік“ ,”Дванаццаць месяцаў”* С.Маршака, *“Мароз Іванавіч”* паводле М.Адоеўскага, *“Кот у ботах”* Г.Калау, для самых маленькіх – *“Казка аб згубленым сумленні”* Л.Усцінава, *“Таямнічы гіпапатам”* В.Ліфшыца і І.Кічанавай, *“Клубнічнае каралеўства”* В.Зіміна.
У трупе тэатра шмат моладзі, многія вучацца завочна у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, і ўдзел у дзіцячых спектаклях – гэта вялікая школа для іх, спроба на арганічнасць, уменне фантазіраваць, шчырасць, захап-ляльнасць. Зараз у рэпертуары тэатра – 13 дзіцячых спек-такляў.
Такімі шляхамі Магілёўскі абласны тэатр драмы і ка-медыі імя В.Дуніна-Марцінкевіча ў г.Бабруйску далучае падрастаючае пакаленне да тэатральнага мастацтва. Ёсць і іншыя формы работы з дзецьмі. Паасобныя школы нала-дзілі пастаянныя сувязі з тэатрам, тут

праводзяцца ўрокі, а потым дзеці пішуць сачыненні–меркаванні пра ўбачанае. Тэатр не можа дазволіць сабе расслабіцца і страціць свайго гледача [11].

26 снежня 2003 г. у *Мазырскім драматычным тэат-ры імя І.Мележа* адбылася прэм’ера казкі “*Снегурушка*” ў пастаноўцы галоўнага рэжысёра тэатра Р.Цыркіна.
27–28 сакавіка 2004 г. у тэатры прайшлі прэм’ерныя паказы спектакля “*Женитьба*”, прымеркаваныя да Міжна-роднага дня тэатра. Рэжысёр Р.Цыркін.
21 мая 2004 г. тэатр запрасіў гледачоў на прэм’еру мо-наспектакля “*Млечны шлях*” па раману К.Чорнага (аўтар інсцэніроўкі і выканаўца В.Шушкевіч).

Адзначыў сваё 15-годдзе *Слонімскі дзяржаўны беларус-кі драматычны тэатр*, афіцыйна адкрыты 1 студзеня 1990 г. Гэта стала падзеяй не толькі ў культурным жыцці г. Слоніма, але і ўсёй рэспублікі. У Беларусі ёсць нямала раённых цэнтраў з большай, чым у Слоніме, колькасцю насельніцтва, але прафесійных тэатраў яны не маюць. У Слоніме – багатыя тэатральныя традыцыі, якія пачынаюц-ца яшчэ са школьных тэатраў рыторыкі і паэтыкі, што дзейнічалі пры Слонімскай езуіцкай рэзідэнцыі ў пачатку XVIII ст., а таксама ад славутага на ўсю Еўропу тэатра Міхаіла Агінскага, які існаваў у Слоніме каля 235 гадоў таму. У 20–30-х гг. XX ст. на Слонімшчыне працавалі драмгурткі. А ў пасляваенныя гады славу і пашану заслу-жыў Слонімскі народны тэатр, які, дзякуючы свайму кі-раўніку М.Варвашэвічу, пазней стаў гаспадарча-разліко-вым тэатрам-студыяй. Увесь гэты час тэатр чакае свайго памяшкання: яшчэ ў 1992 г. Упраўленне “Белбудрэстаў-рацыя” зрабіла праект новага будынка тэатра, і пачалася праца па будаўніцтву. У 1993 г. на гэта было выдзелена з рэспубліканскага бюджэту 17 млн. руб. На той час гэта былі немалыя грошы, але і трэцяй часткі іх так тады і не асвоілі. А з чэрвеня 1993 г. на будоўлі наступіла зацішша, якое працягваецца да гэтага часу. Тут павінен быць моцны і сур’ёзны падрадчык, якога па розных прычынах не знай-шлі. За гэты час у тэатры памянялася некалькі дырэктараў і галоўных рэжысёраў, якія так і не змаглі зрушыць з мес-ца будаўніцтва тэатра, піша ў артыкуле “На руінах тэатра не будзе” загадчык літаратурнай часткі тэатра С.Чыгрын [39].

* * *

Уклад дзяржавы ў развіццё культуры штогод узмацня-ецца. Укладваючы сродкі сёння, дзяржава разумее, што культура павінна даць аддачу ў

перспектыве. Але трэба думаць не толькі пра ўкладзеныя і зарobленыя грошы, а і пра эканамічны механізм гаспадарання, які дасць магчы-масць развіваць культуру. Гаварыць сёння пра дзейнасць тэатраў, канцэртных і іншых установаў – гэта значыць ду-маць і пра тое, як зарабляць на гэта сродкі. Гэтага вымага-юць сучасныя абставіны. Вывучэнне сітуацыі ў блізкім і далёкім замежжы паказвае, што паступова, паэтапна сацы-яльная сфера ад цалкам бюджэтнага фінансавання перахо-дзіла там на рынкавыя рэйкі, на эканамічныя законы сфе-ры паслуг. На працягу пэўнага тэрміну мы таксама будзем абавязаны прыйсці да такой жа мадэлі, і парасткі гэтага павінны быць закладзены ўжо сёння [14].

*Мазура В.Я., галоўны бібліёграф АНІКМ*
*Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

Літаратура

1. ***Альшэўскі Р.*** Герой не нашага часу // Культура. 2004. 19–25 чэрв. (№ 25–26). С. 10.
2. ***Альшэўскі Р.*** Дыялог рэжысёра з драматургам // Культу-ра. 2004. 29 мая – 4 чэрв. (№ 22). С. 10.
3. ***Альшэўскі Р.*** Закрыццё “Адкрытага фармату” // Культу-ра. 27 снеж. 2003–2 студз. 2004 (№ 51–52). С. 18.
4. ***Альшэўскі Р.*** Ці знаў хто, братцы, з вас Тараса... // Куль-тура. 2004. 10–16 крас. (№ 15). С. 8.
5. ***Альшэўскі Р.*** Чым рэха адгукнулася? // Культура. 2003. 8–14 лістап. (№ 45). С. 9.
6. ***Анісенка В.*** “У сваёй прафесіі я – дырыжор...” / Гутары-ла С.Берасцень // ЛіМ. 2004. 4 чэрв. С. 10–11.
7. ***Бунцэвіч Н.*** “Зверскі” спектакль // Культура. 2004. 6–12 сак. (№ 10). С. 9.
8. ***Бяспалы А., Грыцэўскі У.*** Чалавек на вайне / Гутарыў Р.Альшэўскі // Культура. 2004. 3–9 ліп. (№ 27). С. 20.
9. ***Восем*** па дзесяцібальнай: Вынікі тэатр. сезона 2003/2004 г. // Культура. 2004. 14–20 жн. (№ 33). С. 8–9.
10. ***Выніковая*** калегія: набыткі, праблемы, перспектывы // Культура. 2004. 31 студз. – 6 лют. (№ 5). С. 2.
11. ***Грахава А.*** Наш тэатр любіць дзяцей! // Культура. 2004. 16–22 кастр. (№ 42). С. 17.
12. ***Грунт*** для кансалідацыі нацыі // Культура. 27 снеж. 2003 – 2 студз. 2004 (№ 51–52). С. 3.
13. ***Дзянісенка К.*** Любім з дзяцінства // ЛіМ. 2004. 28 мая. С. 2.
14. ***Дражын У.*** “Думаць пра эканамічны механізм гаспада-рання” // Культура. 2004. 31 студз. – 6 лют. (№ 5). С. 2.

15. ***Дудараў А.*** Першыя крокі “армейскага” тэатра / Гутары-ла Т.Команава // Культура. 2004. 3–9 ліп. (№ 27). С. 14.
16. ***Дудараў А.*** Тэатр моцных пачуццяў / Гутарыла Л.Шы-манская // Бел. час. 2004. 24 сент. – 1 окт. (№ 38). С. 19.
17. ***Іваноўскі Ю.*** Дык хто ж вінаваты? // Культура. 2004. 21–27 жн. № 34. С. 8.
18. ***Кірпічэнкава Н.*** Дзяржава і творчая асоба // Культура. 2004. 1–7 мая (№ 17–18). С. 2.
19. ***Команава Т.*** Без фанатызму, даражэнькія! // Культура. 2004. 1–7 мая. (№ 17–18). С. 10, 15.
20. ***Команава Т.*** Вайна ці каханне? // Культура. 2004. 12–21 мая (№ 20). С. 7.
21. ***Команава Т.*** Вялікая перамога “Маленькіх трагедый” // Культура. 2004. 22–28 мая (№ 21). С. 8.
22. ***Команава Т.*** Героі нашага часу // Культура. 2004. 7–13 лют. (№ 6). С. 9.
23. ***Команава Т.*** “Дэтэктар” прафесіяналізму // Культура. 2004. 10–16 крас. (№ 15). С. 8.
24. ***Команава Т.*** Клуб “садаводаў-любіцеляў” // Культура. 2004. 21–27 лют. (№ 8). С. 8–9.
25. ***Команава Т.*** Наказ // Культура. 2004. 3–9 ліп. (№ 27). С. 20.
26. ***Команава Т.*** П’емонцкія жарсці // Культура. 2004. 29 мая – 4 чэрв. (№ 22). С. 10.
27. ***Конкурс*** на стварэнне п’ес для тэатра пад дэвізам “Дзень Перамогі” // Культура. 2003. 20–26 верас. (№ 38). С. 2.
28. ***Лявонава Л.*** Імя новае – мэта нязменная / Гутарыла В.Палякова // ЛіМ. 2004. 15 кастр. С. 10.
29. ***Махаева Г.*** “Любім тэатр з дзяцінства” // Культура. 2004. 17–23 крас. (№ 16). С. 8.
30. ***Новікаў А.*** ... І што рабіць? // Культура. 2004. 21–27 снеж. (№ 34). С. 8.
31. ***Орлова Т.*** Вернуться назад и рвануть вперед // Арлекин. 2004. № 1. С. 14–16.
32. ***Рашэнне*** калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Бела-русь “Аб выкарыстанні сродкаў рэспубліканскага бюджэту і Фон-ду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мас-тацтва па набыцці рэпертуарных твораў і іх практычным пры-мяненні ў творчых калектывах // Культура. 2004. 20–26 сак. (№ 12). С. 4.
33. ***Рэцэпт*** на спектакль // Культура. 2004. 20–26 сак. (№ 12). С. 10.
34. ***Сабалеўскі А.*** “Пацяшаючы, навучаць” // Культура. 2004. 21–27 лют. (№ 8). С. 9.
35. ***Смольская К.*** Пушкін і нашы сучаснікі // Культура. 2004. 28 лют. – 5 сак. (№ 9). С. 7.
36. ***Тэатр*** пачынаецца са школы // Культура. 2003. 13–19 верас. (№ 37). С. 14.
37. ***Філосафы*** – да бар’ера! // ЛіМ. 2003. 3 кастр. С. 5.
38. ***Цімафееў Я.*** Матыльковы палёт // Культура. 2004. 19–25 чэрв. (№ 25–26). С. 10.
39. ***Чыгрын С.*** На руінах тэатра не будзе // Культура. 2004. 29 мая – 4 чэрв. (№

22). С. 4.
***Шыкавец В.*** Новы сезон // Культура. 2003. 4–10 кастр. (№ 40). С. 2.